# КАРТАГРАФІЯ ТВАЁЙ СЭКСУАЛЬНАСЬЦІ:

## ад сэксуальнай арыентацыі да Тэорыі Сэксуальных Канфігурацыяў

Пераклад на беларускую: Андрэй Клішын і Уладзіслаў Гарбацкі, сьнежань 2022 г.




Тэкст: Алекс Янтафі і Мэг-Джон Баркер
Ідэі: Сэры ван Андэрс
Ілюстрацыі: Джулс Шыл

# ЗЬМЕСТ

3 – Уводзіны

4 – Звычайныя шляхі разуменьня сэксуальнасьці

5 – Праблемы з сэксуальнай арыентацыяй 1:
Як мы разумеем гендар?

6 – Праблемы з сэксуальнай арыентацыяй 2:
Што зь іншымі аспэктамі сэксуальнасьці?

7 – Праблемы з сэксуальнай арыентацыяй 3:
Ці яна тая ж для розных тыпаў сэксу і прывабнасьці?

8 – Арыентацыя, статус, ідэнтычнасьць, паводзіны і сэксуальная цяга?

9 – Чаму Сэры распрацавала ТСК?

10 – Думаючы зь межаў

11 – Міжсэкцыйнасьць

12 і 13 – Што ёсьць ТСК?

14 – Асноўныя элемэнты ўсіх рэгіёнаў

15 – Рэгіён 1: Колькасьць партнэраў-ак

16 – Рэгіён 2: Сэксуальнасьць гендар/полу

17 – Рэгіён 3: Іншыя аспэкты сэксуальнасьці

18 – Разгалінаваньне ці супадзеньне?

19 – Флюідная ці нерухомая?

20 – Аб’ядноўваем гэта ўсё: ТСК у паўсядзённым жыцьці

21 – Ці гэта ўсё? У працяг ТСК

22 – Дадатковыя рэсурсы

23 – Глясар тэрмінаў

24 – Біяграфіі

# УВОДЗІНЫ

Гэты зін запрашае цябе далучыцца да падарожжа па сьвеце тваёй сэксуальнасьці.

Перад тым як мы пачнём, варта запомніць некаторыя рэчы:

- Клапаціся пра сябе. Падарожжы такія, як гэтае, могуць крыху дэзарыентаваць. Калі табе падаецца, што тваё дыханьне ці цяглíцы напружваюцца, зрабі перапынак, пацягніся, растрасіся і вяртайся да падарожжа пасьвяжэлым.
- Няма правільнага ці няправільнага падыходу да гэтага падарожжа. Толькі табе вырашаць, як, калі і ці наогул выкарыстоўваць мапу, якую мы табе прапануем. Ты таксама можаш заўважыць, што твае ідэі і адказы зьмяняюцца з часам, і гэта цалкам нармальна.
- Гэта адна тэорыя, і яна можа быць ці ня быць добрым адлюстраваньнем тваёй рэчаіснасьці. Наш спадзёў на тое, што яна можа табе дапамагчы лепш зразумець сябе і тых, хто навокал цябе. Пад канец гэтага падарожжа ў цябе можа быць больш пытаньняў, чым адказаў! Не хвалюйся, напрыканцы зіна пададзеныя дадатковыя рэсурсы для далейшага азнаямленьня і падтрымкі.

І, нарэшце, калі ты не разумееш нейкія словы, што спаткаюцца ў зіне, у канцы ёсьць глясар.



# *Звычайныя шляхі разуменьня*

# СЭКСУАЛЬНАСЬЦІ

Калі ты пытаеш людзей пра іх сэксуальнасьць, яны звычайна мяркуюць, што ты пытаешся пра іх сэксуальную арыентацыю. Гэта значыць гендар людзей, якіх яны знаходзяць прывабнымі ў адносінах да свайго ўласнага гендару.







Гендар і сэксуальная арыентацыя абодва звычайна мяркуюцца бінарнымі (ці/альбо). Чалавек - гэта мужчына ці жанчына. Яны - геі (цяга да “свайго” гендару) ці гетэра (цяга да “адваротнага” гендару).

Некаторыя мадэлі сэксуальнай арыентацыі адкрылі опцыі па-за бінарнасьцю.







Некаторыя бачаць арыентацыю як спэктар (як шкала Кінзі) ці бачаць некалькі спэктраў (як сетка Клейна).

Але ж такія мадэлі ўсё роўна праблемныя таму, што:

1. Яны звычайна прымаюць, што гендар бінарны
2. Яны не ўключаюць аспэкты сэксуальнасьці адрозныя ад гендару
3. Яны не рахуюць іншыя тыпы сэксуальнае цягі ці іншыя формы сэксу.




Мы раскажам крыху больш пра гэтыя праблемы на наступных трох старонках, бо гэта галоўныя прычыны, чаму Сэры ван Андэрс распрацавала тэорыю сэксуальных канфігурацыяў (ТСК), што зьяўляецца галоўнай ідэяй, якую мы будзем абмяркоўваць рэшту гэтага зіну.

# Праблемы з сэксуальнай арыентацыяй 1: *Як мы разумеем* гендар?

Навука і гісторыя навучылі нас, што сэксуальнасьць больш складаная за гетэрасэксуальнасьць і гомасэксуальнасьць, і гендар таксама больш складаны за мужчынскі і жаночы гендары. Часта людзі блытаюць пол з гендарам. Тыповая блытаніна: дзіцё, якое нарадзілася з чэлесам, – гэта хлопчык, а дзіцё, якое нарадзілася з вульвай, – гэта дзяўчынка.

Пол часта ўспрымаецца як фізычная характарыстыка – бачная, як барада, ці нябачная, як храмасома. Гендар часьцей бачны як нашыя сацыяльныя або культурныя ролі і досьведы ці як мы ідэнтыфікуемся.







ТСК пабудаваная на фэміністкіх і квір-ідэях, таму мы выкарыстоўваем гендар/пол як агульны тэрмін, што разрахоўвае пераплеценыя адносіны паміж полам і гендарам, якія нельга акуратна падзяліць.




Табе можа падацца, што зручна апісваць тых, хто нас прыцягвае, з падставы таго, што іх гендар падобны ці адрозны ад нашага, і гэта можа быць праўдай. Але ж тое, што мы называем тым самым ці адрозным, можа вар'іраваць ад адной асобы да іншай. Гэта азначае, што аднолькавасьць – не заўжды ясная арганізацыя сэксуальнасьці. У ТСК ёсьць прастора для прывабнасьці аднолькавасьці і розьніцы, але ж тое, што ты вызначаеш аднолькавым ці адрозным, – гэта твая справа, і яна можа ахопліваць любы аспэкт жыцьця, ня толькі гендар.

# Праблемы з сэксуальнай арыентацыяй 2:
# Што зь іншымі аспэктамі сэксуальнасьці?

Вялікая праблема ў тым, што большасьць мадэляў сэксуальнасьці зашмат сфакусаваныя на адным аспэкце сэксуальнасьці: гендары людзей, якія нас прывабліваюць. Гэта як казаць, што наш краявід складаецца з адных толькі лясоў, і цалкам ігнараваць усе іншыя формы рэльефу.

Іншых рысаў нашае сэксуальнасьці, на якія мы маглі б аднолькава зьвярнуць увагу, больш, уключна з наступнымі. Ты можаш падумаць, якія рэлевантныя для цябе і якім чынам:



- Нашыя ўзроўні сэксуальнай прывабнасьці (ад ніякай да вялікай)
- Фізічныя аспэкты цягі, не зьвязаныя зь гендарам (такія як усьмешка, колер вачэй ці форма і памер цела)
- Колькасьць партнэраў-ак, якую мы жадаем мець (ад ніводнага-ай да шматлікіх)
- Узрост і досьвед людзей, якія для нас прыцягальныя ў адносінах да нашых уласных узросту і досьведу
- Ці зьвязаная нашая сэксуальнасьць з уладай і дзе мы жадаем быць у адносінах да ўлады (напрыклад, дамінант-ка, падпарадкаванец-ка, абое ці ніводны)
- Ролі, якія мы жадаем іграць сэксуальна (напрыклад, актыўная ці пасіўная, ініцыятыўная ці прымальная)
- Тыпы пачуцьцяў, фантазіяў і досьведаў, якія нам найбольш даспадобы сэксуальна.

Усе яны могуць быць настолькі ж істотнымі ў вызначэньні нашае сэксуальнасьці, як і гендар людзей, якія нам прывабныя.



# Праблемы з сэксуальнай арыентацыяй 3:
# Ці яна тая ж для розных тыпаў сэксу і цягі?

Калі мы пачынаем разьбіраць адрозьненьні паміж лясамі, азёрамі, гарадамі, гарамі і прэрыямі, мы заўважаем, як шмат досьведаў сэксуальнасьці існуе навокал.

Напрыклад, некаторыя людзі аддаюць перавагу эратычным досьведам сам-насам, напрыклад мастурбацыі, а іншыя людзі атрымліваюць асалоду ад сэксу з партнэр-к-амі. Адна і тая ж персона можа некалі абіраць сэкс сам-насам, а ў іншыя перыяды ў сваім жыцьці сэкс з партнэр-к-амі.



Некаторых людзей зусім ня цягне сэксуальна да іншых людзей, ці іх цягне без сэксуальных пачуцьцяў. Некаторыя людзі могуць быць эмацыйна і рамантычна прывязаныя да іншых людзей, а іншыя – не. Мы можам адчуваць сэксуальную цягу (пажаду) да кагосьці, але ж ня мець да іх рамантычных пачуцьцяў каханьня, ці кахаць іх і ня мець пажадлівых пачуцьцяў.

Як бачыш, краявіды сэксуальнасьці багатыя і разнастайныя. Мы можам назваць іх экасыстэмай! Азёры ня больш і ня менш прыгожыя ці неабходныя, чым дрэвы і горы. Гэтак жа экасыстэма чалавечае сэксуальнасьці вялізарная і ніводная ейная частка не больш валідная за іншую.

# Арыентацыя, *статус*, ідэнтычнасьць, *паводзіны* і сэксуальная цяга?

Перад тым як мы паглыбімся ў ТСК, істотна вызначыць, што часам незразумела, што азначае само слова «сэксуальнасьць».

Напрыклад, тыпы людзей, роляў ці досьведаў, на якіх мы сэксуальна арыентаваныя, могуць адрозьнівацца ад нашага сэксуальнага статусу: з кім і што мы робім сэксуальна ў пэўны час і ў пэўным месцы.

Ты можаш падумаць пра свае ўласныя прыклады.

Тэрмін «сэксуальнасьць» звычайна выкарыстоўваецца, каб акрэсьліць сэксуальную ідэнтычнасьць, сэксуальныя паводзіны і сэксуальную цягу. Але ж людзі могуць быць у розных месцах па гэтых крытэрах.







Напрыклад, калі ты падлічыш колькасьць маладых дарослых людзей, якіх прываблівае больш за адзін гендар, то атрымаецца недзе 40%. Калі падлічыш, колькі сябе ідэнтыфікуюць як бісэксуалы-кі, пансэксуалы-кі ці квір, то будзе хутчэй 2%. Але ж нашмат больш за 2% маладых дарослых людзей маюць сэкс зь людзьмі з больш чым адным гендарам, але ж ідэнтыфікуюцца як геі ці гетэра або не маюць налепкі ідэнтычнасьці.

Нашыя сэксуальнасьці таксама дынамічныя і флюідныя. Іх аспэкты могуць зьмяняцца зь цягам часу, але ж некаторыя застаюцца даволі нерухомымі.

Мы, канешне, не жадаем сказаць, што мы можам сьвядома зьмяніць уласную сэксуальнасьць. Яна, хутчэй, як узрост. Яна непазьбежна зьменіцца з часам, але ж мы ня можам выклікаць зьмену. Калі нехта вельмі хоча зьмяніць тваю сэксуальнасьць, ты можаш запытаць сябе чаму, нашто ім гэта і ці рупяцца яны пра твае інтарэсы.

# Чаму СЭРЫ распрацавала ТСК

Гэта Сэры ван Андэрс. Яна стварыла ТСК, каб вынайсьці разуменьне сэксуальнасьці, якое вырашае некаторыя з праблемаў, якія мы абмеркавалі.

Давай паслухаем яе крыху больш пра тое, чаго яна хацела ад ТСК.




Каб дапамагчы людзям скласьці мапы сваіх асабістых сэксуальных канфігурацыяў, Сэры стварыла дыяграмы, што вы ўжо бачылі на некаторых старонках гэтага зіну. Мы будзем абмяркоўваць гэтыя канцэпты, але калі ты жадаеш стварыць уласную мапу сэксуальнасьці з дапамогай ТСК ці зрабіць уласныя дыяграмы, паглядзі на спасылкі і матэрыялы ў канцы. І хоць мы і не абмяркоўваем твой уласны гендар/пол тут, ты можаш знайсьці спасылкі і пра гэта.

# Думаючы зь МЕЖАЎ

Адна з істотных рысаў ТСК – гэта грунтаваньне на фэмінісцкіх і квір-тэорыях, празь якія яна набывае лінзу сэксуальнай разнастайнасьці.

Гэта значыць, што замест цэнтраваньня ўсіх рэчаў, якія дамінантная культура можа назваць нормай, і таму «нармальных», ТСК цэнтруе непасрэдныя жыцьцёвыя досьведы рэальных людзей. Кожны мае лякацыю.

Гэта значыць заўважаць колькі з нас маюць целы, жаданьні, сэксуальныя цягі, арыентацыі, стасункі і досьведы па-за нарматыўнасьцямі, цэнтраванымі ў заходніх англа-базаваных культурах.

Часам яны называюцца маргіналізаванымі целамі, ідэнтычнасьцямі і досьведамі таму, што яны на межах культурных і сацыяльных нормаў. Але ж, калі мы паглядзім навокал, мы можам заўважыць, якімі шматлюднымі бываюць гэтыя межы і што мы не такія адзінокія, як можа падавацца.



# Міжсэкцыйнасьць

Калі мы ўглядаемся ў краявід, мы не заўжды праходзім кожную сьцяжыну і заўважаем кожную рэчку ці дрэва. Адпаведна, мы не заўжды думаем пра тое, як шмат кампанэнтаў складаюць нашую сэксуальнасьць і як разам яны нашмат большыя за суму іх частак.

Міжсэкцыйнасьць – гэта тэрмін, прапанаваны амэрыканскай чорнай фэміністкай Кімбэрле Крэншоў для апісаньня таго, як нашыя сацыяльныя ідэнтычнасьці апэруюць паміж шматлікімі сыстэмамі прыгнёту, дыскрымінацыі і прывілеяў, якія разам спэцыфічна ўплываюць на нашае жыцьцё.

Напрыклад, сэксуальнасьць перакрыжоўваецца з наступнымі і іншымі рэчамі:

- як мы расізаваныя, то-бок, як людзі могуць разумець нашу расу і этнічнасьць на падставе пэўных характарыстыкаў
- наша клясавае паходжаньне і бягучы статус
- ці маем мы інваліднасьці і як сьвет арганізаваны ў дачыненьні да іх
- які ў нас узрост і ў якім пакаленьні мы ўзрасталі
- наша рэлігія і/або каштоўнасьці




Якія твае перакрыжаваньні ў дачыненьні да сэксуальнасьці? Якія аспэкты тваёй ідэнтычнасьці фармуюць ці сфармавалі досьвед тваёй сэксуальнасьці?

# Што

## Адзіноцтва і партнэрства

ТСК адрозьнівае сэксуальнасьць самнасам і з партнэр-к-амі. Кожны мае патэнцыял удзельнічаць у абедзьвюх, часам у розныя часы ў нашым жыцьці, часам аднparticipating часова.

Адзіноцтва і партнэрства – гэта розныя бакі выспы ТСК. Мапа партнэрскай сэксуальнасьці пакуль што больш дэталяваная, чым мапа адзіночнай сэксуальнасьці, і ўключае ў сябе тры рэгіёны, як можаш пабачыць на мапе. Абодва бакі аднолькава істотныя і фундамэнтальныя, але ж адзін атрымаў больш фокусу за іншы ў акадэмічнай тэорыі.

Вельмі важна кінуць выклік распаўсюджанай ідэі аб тым, што адзіночны сэкс менш “правільны” за партнэрскі сэкс. Абодва аднолькава магчымыя шляхі праявы нашае сэксуальнасьці і ўключаюць складаныя і разнастайныя краявіды.






# ёсьць ТСК?




## Эратычнасьць і клапатлівасьць

Пэўныя рысы праходзяць праз абодва бакі адзіночнай і партнэрскай сэксуальнасьці. Але ж у ТСК гэтыя асаблівасьці былі пакуль што прыкладзеныя толькі да партнэрскай сэксуальнасьці.

Мы намалявалі эратычнасьць як адкрытую зямлю на гэтай высьпе, а клапатлівасьць як лясныя ці гарыстыя часткі. Некаторыя часткі даволі адкрытыя зь некалькімі дрэвамі, каб паказаць месцы перакрыжаваньня эратычнасьці з клапатлівасьцю.

Эратычнасьць азначае аспэкты сэксуальнасьці, датычныя асалоды, пачуцьця ўзбуджэньня, пажады, аргазмаў і г.д. Клапатлівасьць адпавядае інтымнасьці і пачуцьцям любові і блізкасьці. Абодва могуць быць фізычнымі ці псыхалягічнымі, як цеплыня ад таго, што цябе кахаюць, ці чаканьне асалоды ад дотыку да палавых органаў.

Пакуль мы працягваем, табе можа быць цікава накінуць сваю вэрсію гэтае выспы. Што будзе адбывацца на адзіночным і партнэрскім баках выспы? Як выглядаюць эратычнасьць і клапатлівасьць у тваім жыцьці? Ці яны адрозныя, ці цалкам пераплеценыя? Ці шукаеш ты іх у адных і тых жа ці розных стасунках? Наколькі вялікія ці істотныя розныя рэгіёны тваёй мапы?

На наступных трох старонках мы разгледзім галоўныя часткі партнэрскага боку выспы: колькасьць партнэраў-ак, гендар/пол і іншыя аспэкты. Май на ўвазе, што гэтыя часткі для цябе могуць быць зьвязаныя.

# АСНОЎНЫЯ ЭЛЕМЕНТЫ ЎСІХ РЭГІЁНАЎ

Дыяграмы ТСК могуць дапамагчы табе зрабіць мапу некаторых рэчаў, якія мы абмеркавалі, і надаць пэўнае візуальнае адлюстраваньне аспэктам тваёй партнэрскай сэксуальнасьці. Для ўсіх рэгіёнаў, на якія мы будзем глядзець, – колькасьць партнэраў-ак, сэксуальнасьць гендар/полу, і іншыя аспэкты сэксуальнасьці – ТСК уключае наступныя элемэнты:

- моц элемэнта (наколькі ён істотны для тваёй сэксуальнасьці)
- наколькі ён спэцыфічны (твая сэксуальнасьць у гэтым рэгіёне вельмі спэцыфічная ці даволі шырокая)
- твая пазіцыя ў рэгіёне пасуе навакольнай культуры вакол цябе ці стварае ёй выклік

Дыяграмы ТСК адлюстроўваюць гэтыя рэчы на дыяграмах, як гэтая. Напрыклад, на дыяграме сэксуальнасьці гендар/полу (рэгіён 2):




Моц паказаная як вертыкаль на дыяграме – напрыклад, калі гендар/пол твайго-ёй партнэра-кі неістотны, ты будзеш унізе, калі вельмі істотны, ты будзеш наверсе.

Спэцыфічнасьць паказаная на вялікім коле – напрыклад, калі цябе цягне толькі да жанчынаў, ты паставіш кропку на левым баку, а калі цябе вабяць некалькі гендараў, ты замалюеш больш вялікую плошчу.

Як ты ставішся да культурных нормаў, паказана там, дзе ты ставіш сябе ў галоўнай сэкцыі вялікага кола ці ў сэктары, падпісаным “выклік гендар/полу”, які паказвае перасяганьне, супраціў, неадпавяданьне ці выклік нормам.

З запаўненьня дыяграмаў можна даведацца нашмат больш дэталяў, таму, калі табе цікава дазнацца больш, паглядзі на спасылкі напрыканцы.

# РЭГІЁН 1: КОЛЬКАСЬЦЬ ПАРТНЭРАЎ-АК

Рэгіён колькасьці партнэраў-ак падразумявае колькі партнэраў-ак мы жадаем мець.

Як і зь іншымі рэгіёнамі, ён можа быць паказаны эратычнымі ці клапатлівымі бакамі, якія могуць быць аднолькавымі ці рознымі. Ці, можа, сэксуальнасьць для цябе ахоплівае адначасова абодва бакі?

Падумай пра тое, дзе ты на спэктры ад нуля да шматлікіх, калі пытаньне заходзіць пра колькасьць партнэраў-ак, якую ты жадаў бы мець.




Ты можаш паставіць сабе наступныя пытаньні:

- Наколькі моцны гэты аспэкт тваёй сэксуальнасьці ад “зусім не” да “вельмі”?
- Наколькі спэцыфічны гэты аспэкт? Ці табе патрэбная толькі пэўная колькасьць патрнэраў-ак, ці табе будзе даспадобы шэраг опцыяў?
- Ці яны аднолькавыя для эратычнасьці і клапатлівасьці?
- Як яны злучаюцца зь іншымі рэгіёнамі (гендар/пол і іншыя аспэкты)?
- Ці значыць тваё месца на гэтым аспэкце, што ты лічышся ў межах нормы ў тваёй культуры, альбо ты кідаеш ёй выклік і як гэта ўплывае на цябе або тваіх партнэраў-ак?
- Ці адлюстраваная твая арыентацыя па гэтым аспэкце сэксуальнасьці ў тваім бягучым статусе?
- Як яна перакрыжоўваецца з тваёй міжсэкцыйнасьцю (напрыклад, гендар, раса, кляса, узрост, інваліднасьць і г.д.)?

# Рэгіён 2: СЭКСУАЛЬНАСЬЦЬ ГЕНДАР/ПОЛУ

Сэксуальнасьць гендар/полу – пра тое, да каго нас цягне ў тэрмінах гендару, полу і гендар/полу.

Як з усімі аспэктамі сэксуальнасьці, гэта можа быць падобна ці адрозьнівацца ў тэрмінах таго, да каго нас цягне (арыентацыя) і з кім мы ў партнэрстве (статус).

Сэксуальнасьць гендар/полу ў ТСК уключае разам і сэксуальнасьці гендар/полу, якія адпавядаюць сацыяльным і культурным чаканьням, і тыя, што кідаюць выклік. Гэта значыць, што і бінарныя, і небінарныя аспэкты полу, гендару і гендар/полу могуць быць адлюстраваныя ў ТСК.

Гэта можа быць вельмі незразумела, таму ты можаш зноўку паглядзець старонку 5, дзе мы абмяркоўвалі розьніцу паміж гендарам, полам і гендар/полам.




Давай перадыхнём і падумаем, што гэта ўсё значыць для цябе:

- Наколькі моцны гэты аспэкт тваёй сэксуальнасьці ад “зусім не” да “вельмі”?
- Наколькі спэцыфічны гэты аспэкт? Ці цябе прыцягваюць вельмі спэцыфічныя праявы гендар/полу, ці табе пасуе шырокае кола праяваў?
- Ці яны аднолькавыя для эратычнасьці і клапатлівасьці?
- Наколькі істотныя гендар, пол і гендар/пол іншых для цябе?
- Наколькі гэта зьвязана зь іншымі рэгіёнамі (колькасьць партнэраў-ак і іншыя аспэкты)?
- Ці значыць тваё месца на гэтым аспэкце, што ты лічышся ў межах нормы ў тваёй культуры, альбо ты кідаеш ёй выклік і як гэта ўплывае на цябе або тваіх партнэраў-ак?
- Ці карысна для цябе падзяленьне гендару і полу?
- Ці адлюстраваная твая арыентацыя па гэтым аспэкце сэксуальнасьці ў тваім бягучым статусе?
- Як яна перакрыжоўваецца з тваёй міжсэкцыйнасьцю (напрыклад, гендар, раса, кляса, узрост, інваліднасьць і г.д.)?

# Рэгіён 3: *іншыя аспэкты* сэксуальнасьці

Як мы бачылі на старонцы 6, існуе шмат іншых аспэктаў сэксуальнасьці, якія могуць быць такімі ж важнымі, як колькасьць партнэраў-ак і гендар/пол, ці яшчэ больш.

Гэты рэгіён тваёй выспы можа быць завялікім і падраздзяляцца на розныя шматлікія зоны і тэрыторыі, якія ахопліваюць поўную складанасьць тваёй сэксуальнасьці.

Зноў жа, тое, што цябе прыцягвае з пункту гледжаньня іншых аспэктаў, можа быць падобным або розным у адносінах да эротыкі і клапатлівасьці. Напрыклад, тое, што прываблівае цябе ў сэксуальным плане, можа ня вабіць цябе, калі ты шукаеш эмацыйна блізкіх адносінаў, ці наадварот. Табе могуць падабацца пэўныя віды фізічнага дакрананьня ад рамантычнага-ай партнэр-а-кі, але не ад выпадковага сэксуальнага-ай партнэр-а-кі. Або гэтыя рэчы могуць быць аднолькавымі для цябе.




Ты таксама можаш паставіць сабе наступныя пытаньні:

- Наколькі моцны гэты аспэкт тваёй сэксуальнасьці ад “зусім не” да “вельмі”?
- Наколькі яны спэцыфічныя? Напрыклад, табе падабаюцца досыць канкрэтныя рэчы ў сэксуальным пляне ці шырокі спэктар магчымасьцяў?
- Гэтыя аспэкты падобныя ці адрозныя для твайго эратычнага і эмацыйнага досьведу?
- Як гэта зьвязана зь іншымі рэгіёнамі тваёй сэксуальнасьці (колькасьць партнэраў-ак, гендар/пол)?
- Ці значыць тваё месца ў гэтым аспэкце, што ты лічышся ў межах нормы ў тваёй культуры, альбо ты кідаеш ёй выклік і як гэта ўплывае на цябе або тваіх партнэраў-ак?
- Ці адлюстраваная твая арыентацыя па гэтым аспэкце сэксуальнасьці ў тваім бягучым статусе?
- Як гэта зьвязана з тваёй міжсэкцыйнасьцю (напрыклад, гендар, раса, кляса, узрост, інваліднасьць і г.д.)?

# Разгалінаваньне ці Супадзеньне?

Спадзяемся, цяпер ты разумееш, наколькі шматграннай ёсьць наша сэксуальнасьць. Напрыклад, мы можам мець розныя сэксуальныя цягі з пункту гледжаньня людзей, зь якімі мы любім фліртаваць, мець зносіны або наладжваць розныя віды адносін. Мы можам шукаць розных людзей для розных формаў блізкасьці (напрыклад, выслухоўваньне, абдымкі, парады або практычная падтрымка).

У больш шырокай культуры часта лічыцца, што лепш ці «ідэальна», калі ўсе аспэкты сэксуальнасьці супадаюць. Прыкладам супадзеньня будзе жанчына, што лічыць сябе гетэрасэксуалкай, праяўляе сэксуальную цікавасьць да мужчынаў і наладжвае адносіны з мужчынамі.

Аднак, насамрэч, розныя аспэкты нашае сэксуальнасьці часта разгаліноўваюцца, а не супадаюць, і гэта не лепш і не горш.

Калі мы прызнаем, што разгалінаваньне гэткае ж чыннае, як і супадзеньне, мы можам спыніць спробы супастаўленьня нейкаму ідэалу і прыняць унікальны ляндшафт кожнае нашае сэксуальнасьці.



# Флюідная ці НЕРУХОМАЯ?



ТСК уключае ідэю, што сэксуальнасьць не вызначаная на ўсё жыцьцё. Напрыклад, калі мы старэем, мы часта маем зусім іншае разуменьне сваёй сэксуальнасьці і адносінаў, у якіх мы былі, чым на больш раньніх этапах нашага жыцьця.

Дасьледуючы поле сэксуальнасьці, мы можам пайсьці па адной сьцежцы і адкрыць для сябе нечаканы лужок. Мы можам павярнуць назад і вырашыць пайсьці іншым шляхам. Мы можам заўважыць новыя рысы краявіду, якія мы не заўважылі ў першы раз, калі ішлі той жа сьцежкай.

Куды б цябе ні завяло тваё падарожжа, мы спадзяемся, што гэты зін можа быць адной з мапаў, да якой ты зможаш вяртацца, калі захочаш ці калі табе спатрэбіцца паразважаць пра тое, дзе ты быў, дзе ты знаходзішся і якія магчымасьці могуць цябе чакаць.

Калі ты зацікаўлены-ая ў больш дэталёвым адлюстраваньні сваіх сэксуальных канфігурацыяў з дапамогай дыяграмаў, распрацаваных Сэры, або калі ты хочаш выкарыстоўваць гэтую тэорыю ў сваім дасьледаваньні, ёсьць спасылкі на дадатковыя рэсурсы, якія дапамогуць табе ў гэтым!

# Аб'ядноўваем гэта ўсё: ТСК у нашым паўсядзённым жыцьці

Магчыма, ты памятаеш, што Сэры хацела ўключыць жывы досьвед людзей пра чалавечую сэксуальнасьць, калі яна распрацавала ТСК. Гэта важна, бо часам можа падацца, што культура вакол нас (мэдыі, сем'і, школа, сябры, рэлігійныя суполкі і г.д.) кажа нам, што існуе АДЗІНЫ правільны спосаб

Аднак у часе і прасторы сэксуальнасьць была шматграннай, і гэтыя грані часам бываюць вельмі важныя для людзей і культур, а часам менш важныя. Напрыклад, мы нават не гаварылі тут пра экасэксуальнасьць, што зьяўляецца эратычнай і клапатлівай сувязьзю, якую маюць некаторыя з нас зь зямлёй, уключаючы глебу, ваду і расьліны.

Як людзі, мы маем вялікую здольнасьць любіць і атрымліваць задавальненьне незалежна ад таго, самі мы або зь іншымі! Што мы лічым важным, да каго адчуваем цягу, якую цягу, што мы шукаем – гэта можа мяняцца ўвесь час. Наколькі спэцыфічныя ці не нашыя цягі, колькі ў нас партнэр-аў-ак і наколькі моцна мы адчуваем важнасьць таго ці іншага аспэкту нашай сэксуальнасьці – усё ёсьць пытаньнямі, на якія мы безупынку шукаем адказы.






# Ці гэта ўсё?
# У працяг ТСК

Перш чым скончыць наша сумеснае падарожжа, хацелася б перагледзець адну з ідэяў, аб якой мы ўжо вялі размову.

Як мы казалі раней, ТСК – гэта адна з тэорыяў, а не Тэорыя зь вялікай літары. Гэта азначае, што гэта проста адна геніяльная ідэя, з дапамогай якой прафэсарка Сэры ван Андэрс дасьледавала шырокае поле чалавечае сэксуальнасьці.

Калі ласка, выкарыстоўвай ТСК як інструмент, калі лічыш, што гэта карысна. Таксама нядрэнна прыдумаць новыя ідэі, пашырыць поле, зьмяніць мапу або адкінуць яе зусім. Частка навукі – тэставаньне ідэяў на практыцы.



Мы спадзяемся, што табе спадабалася далучыцца да нас у гэтым адмысловым падарожжы! Калі ты хочаш даведацца больш пра гэтыя тэмы, на наступнай старонцы ёсьць некаторыя дадатковыя рэсурсы.

# ...дадатковыя РЭСУРСЫ

Арыгінальны артыкул, на аснове якога створаны зін:

van Anders, S. M. (2015). Beyond sexual orientation: Integrating gender/sex and diverse sexualities via sexual configurations theory. Archives of Sexual Behavior, 44(5), 1177-1213.

Калі ты хочаш прачытаць іншыя даступныя агляды некаторых тэорыяў, на якіх заснаваны гэты зін, можаш знайсьці іх тут:

Barker, M-J. (2018). The psychology of sex. London: Routledge and Psychology Press.
Barker, M-J. & Scheele, J. (2016). Queer: A graphic history. London: Icon Books.
Collins, P. H., & Bilge, S. (2016). Intersectionality. Cambridge: Polity Press.
Crenshaw, K. (2018). On Intersectionality: Essential Writings. New York City: The New Press.
hooks, b. (2000). Feminism is for everybody: Passionate politics. London: Pluto Press.
Serano, J. (2013). Excluded: Making feminist and queer movements more inclusive. Berkeley: Seal Press (www.juliaserano.com).

У гэтых дапаможніках пра гендар, пол і ўзаемаадносіны ўсе гэтыя ідэі разглядаюцца глыбей і з большай колькасьцю практыкаваньняў:

Barker, M-J. & Hancock, J. (2017). Enjoy sex (how, when and if you want to): A Practical and inclusive guide. London: Icon Books. (megjohnandjustin.com)
Barker, M-J. (2018). Rewriting the rules: An anti self-help guide to love, sex and relationships. London: Routledge. (rewriting-the-rules.com)
Iantaffi, A. & Barker, M-J. (2017). How to understand your gender: A practical guide for exploring who you are. London: Jessica Kingsley.

На старонцы rewriting-the-rules.com ты можаш знайсьці зіны пра тое, як даглядаць за сабой і заставацца з сваімі пачуцьцямі, калі ты лічыш гэтыя дасьледаваньні складанымі. На megjohnandjustin.com ты можаш знайсьці зіны, якія дапамогуць напісаць свае уласныя дапаможнік па сэксе, мапу эратычных фантазіяў, і кіраўніцтва па адносінах.



# ГЛЯСАР ТЭРМІНАЎ

**Адзіночная сэксуальнасьць:** Аспэкты нашай сэксуальнасьці, якія не ўключаюць іншых людзей, напрыклад, мастурбацыя.

**Аласэксуальнасьць:** сэксуальная цяга да іншых людзей, супрацьлегасьць асэксуальнасьці.

**Арамантычная асоба (арамантык, арамантыца, нерамантычная асоба):** Асоба, якая не адчувае рамантычнага пачуцьця.

**Арыентацыя:** Сэксуальная арыентацыя ахоплівае тыпы людзей, роляў або практык, да якіх у нас звычайна праяўляюцца сэксуальныя цяга і памкненьні.

**Асэксуал-ка:** Асоба, якая не адчувае сэксуальнай цягі.

**БДСМ-асоба:** Асоба, якая атрымлівае асалоду ад улады, моцных адчуваньняў і/або ролевых гульняў. БДСМ расшыфроўваецца як **BD** (*Bondage & Discipline* — зьвязваньне і дысцыпліна), **DS** (*Domination & Submission* — панаваньне і падпарадкаваньне) і **SM** (*Sadism & Masochism* — садызм і мазахізм).

**Бінарнасьць:** Успрыманьне рэчаў толькі ў дваістай пэрспэктыве, напрыклад, альбо ты гомасэксуальная, альбо гетэрасэксуальная асоба.

**Бісэксуал-ка (бі):** Асоба, якую прыцягвае больш чым адзін пол.

**Буч (англ.** ***butch*****):** Маскулінныя азначэньне, роля, вонкавы выгляд, якія часам радыкальныя адносна гендарнай нормы; выраз звычайна выкарыстоўваецца сярод лесьбіек, геяў, бі+ і квір-супольнасьці.

**Гей:** Асоба, якую прыцягваюць асобы свайго полу. Часам панятак выкарыстоўваецца як агульны тэрмін, але часта азначае толькі геяў-мужчынаў.

**Гендар:** Сацыяльныя ролі таго, што падыходзіць для мужчынаў, жанчынаў або іншых гендараў, ці нашае адчуваньне сябе як жанчыны, мужчыны ці небінарнай асобы.

**Гендар/пол:** Агульны тэрмін для адлюстраваньня пераплеценых адносінаў паміж полам і гендарам і таго, як яны не заўсёды лёгка могуць быць аддзеленыя.

**Гетэрасэксуальная асоба:** асоба, якую прыцягваюць людзі «іншага» полу. Гэта пазнака ідэнтычнасьці, бо людзі могуць ідэнтыфікаваць сябе як гетэрасэксуал-ы-кі, але пры гэтым займацца сэксам зь людзьмі розных гендараў.

**Дамінант-ка (гаспадар-ыня, верхн-і-яя, топ/top):** асоба, якая мае больш уладную ролю ў сэксуальных падпарадкавальных стасунках і/або іншых неканвэнцыйных практыках (некаторыя выкарыстоўваюць слова топ/top для больш актыўнай і/або пранікальнай ролі).

**Ідэнтычнасьць (тоеснасьць):** Як мы апісваем або пазначаем сябе, напрыклад, сэксуальныя тэрміны ідэнтычнасьці ўключаюць бісэксуальнасьць, асэксуальнасьць або падпарадкавальную сэксуальнасьць.

**Квір:** часам выкарыстоўваецца як агульны тэрмін для людзей, якія не зьяўляюцца гетэрасексуал-к-амі або цысгендар-к-амі. Таксама выкарыстоўваецца для любых ненарматыўных (сэксуальных, гендарных) адносінаў і практыкаў.

**Клапатлівасьць:** Інтымнасьць, а таксама пачуцьцё любові і блізкасьці.

**Лесьбійка (лесьбіянка):** Жанчына, якую прыцягваюць іншыя жанчыны.

**Манагамія:** Наяўнасьць толькі адных блізкіх рамантычных і/або сэксуальных адносінаў і згода на эксклюзіўнасьць.

**Маргіналізаваныя групы (маргіналы):** Людзі, якія знаходзяцца па-за межамі таго, што лічыцца культурнай «нормай», і наагул прыгнечаныя з-за некаторых аспэктаў цела, ідэнтычнасьці і/або досьведу.

**Міжсэкцыйнасьць (інтэрсэкцыйнасьць):** Тэрмін чорнай фэміністкі Кімбэрле Ўільямс Крэншоў для апісаньня перакрыжаваных сацыяльных ідэнтычнасьцяў і зьвязаных зь імі сістэмаў прывілеяў і прыгнёту, якія ўплываць на нашае жыцьцё.

**Моц:** У тэорыі сэксуальных канфігурацыяў (ТСК) моц паказвае ступень важнасьці аспэкту сэксуальнасьці ў чым-небудзь жыцьці. Яна можа вар'іравацца ад 0% (неактуальна або няважна) да 100% (вельмі важна/істотна).

**Нарматыўнасьць:** Набор культурных нормаў, якія часта прымаюцца як належнае (напрыклад, гетэранарматыўнасьць – гэта распаўсюджаная думка, што нармальна быць гетэрасэксуалам, што маргіналізуе лесьбіек, геяў і бісэксуал-аў-ак, пансэксуал-аў-ак і квір-асобаў).

**Небінарная асоба або гендарквір:** Асоба, якая знаходзіцца па-за межамі двайковага бінарнага гендару – мужчынскага ці жаночага.

**Неманагамнасьць:** Наяўнасьць некалькіх рамантычных і/або сэксуальных адносінаў.

**Падпарадкаван-ец-ка (пакорлів-ец-іўка, нявольні-к-ца, ніжн-і-яя, саб/sub, ботам/bottom):** Асоба, якая прымае падпарадкаваную ролю і саступае ўладн-аму-ай партнэр-у-цы ў палавых і/або іншых неканвэнцыйных плоцевых зносінах. (Некаторыя выкарыстоўваюць слова *ботам* для больш пасіўнай ролі.)

**Поліаморыя (шматкаханства):** Мадэль адносінаў, у якой магчыма ці ідэальна мець некалькі рамантычных і/або палавых партнэр-аў-ак.

**Пансэксуал-ка:** Асоба, якая мае цягу да людзей усіх гендараў. Часам пансэксуал-ы-кі кажуць пра тое, што гендар не зьяўляецца важнай ці значнай часткай іх цягі.

**Партнэрская сэксуальнасьць:** Сэксуальнасьць, якая ўключае іншых людзей. Колькасьць людзей можа вар'іравацца ад аднаго да многіх.

**Пераключальні-к-ца (універсал-ка, аўтарэвэрс):** Асоба, якая можа быць як дамінантнай, так і падпарадкаванай у сэксуальных зносінах, ніжняй ці верхняй.

**Пол:** Панятак можа выкарыстоўвацца для абазначэньня цялесных (плоцевых) аспэктаў асобы, напрыклад, наш пол, атрыманы пры нараджэньні. Гэтыя аспэкты могуць быць зьнешнімі або ўнутранымі і могуць мяняцца ці не мяняцца зь цягам часу (напрыклад, палавыя прыкметы, такія як барада і грудзі, узровень гармонаў, храмасомы).

**Спэцыфічнасьць:** Адкрытасьць ці спэцыфічнасьць аспэкту нашае сэксуальнасьці ў тэорыі сэксуальных канфігурацыяў (ТСК). Ступень спэцыфічнасьці/адкрытасьці можа быць высокай або нізкай. Напрыклад, мы можам быць адкрытымі для знаёмства зь любой колькасьцю партнэр-аў-ак або толькі з адн-ым-ой партнэр-ам-кай.

**Статус:** Тое, што мы робім у пэўны час і ў пэўным месцы. Напрыклад, колькасьць партнэраў-ак, якія ў нас ёсьць у пэўны момант і час.

**Сэкс:** Сэксуальны досьвед, сэксуальныя практыкі, напрыклад, мастурбацыя або сэкс з партнэр-ам-кай.

**Сэкс-праца (сэкс у абмен):** Сэксуальная праца ў абмен на грошы, тавары ці жыльлё. Напрыклад, аплата за сэкс з кімсьці ці атрыманьне наркотыкаў або жыльля на адну ці некалькі начэй у абмен на палавыя зносіны.

**Сэксуальная разнастайнасьць:** Розныя спосабы, якімі мы выказваем нашу сэксуальнасьць.

**Трансгендарная асоба (трансгендар):** Агульны тэрмін для людзей, чый пол, атрыманы пры нараджэньні, адрозьніваецца ад іх гендарнай ідэнтычнасьці.

**Тэорыя сэксуальных канфігурацыяў (ТСК, Sexual Configurations Theory, SCT):** Тэорыя, створаная прафэсаркай Сэры ван Андэрс на аснове фэміністкай навукі і квір-тэорыі, каб ахапіць і ўключыць як мага больш жывых досьведаў сэксуальнасьці.

**Фам (фр.** ***femme*****):** Фэмінная, жаноцкая роля і/або зьнешні выгляд.

**Флюід:** Тое, што мяняецца зь цягам часу. Маецца на ўвазе гендар-флюід.

**Халасьця-к-чка (адзіночн-ік-іца):** Асоба, якая не знаходзіцца ў партнэрскіх адносінах.

**Цысгендарная асоба (цыс):** Асоба, пол, вызначаны пры нараджэньні, і гендарная ідэнтычнасьць якой супадаюць, напрыклад, нехта нарадзіўся мужчынам і далей ідэнтыфікуе сябе як мужчына.

**Эратычнасьць:** Такія аспэкты сэксуальнасьці, як асалода, узбуджанасьць, пажада, аргазм і г.д.

# БІЯГРАФІІ

СЭРЫ ВАН АНДЭРС

Я – навукоўца і дасьледніца, праводжу і выкладаю сэкс-дасьледаваньні, сацыяльную нэйраэндакрыналёгію, фэмінісцкія/квір-штудыі, а таксама гендарную/палавую і сэксуальную разнастайнасьць. Каля дзесяці гадоў я працавала ў Мічыганскім унівэрсытэце, але цяпер вярнулася ў Канаду як дасьледніца ў межах праграмы “Канада 150” (Canada 150 Research Chair) па сацыяльнай нэйраэндакрыналёгіі, сэксуальнасьці, і гендар/поле ва ўнівэрсытэце Куінс. Я таксама партнэрка, бацькоўка, умеркаваная радыкалка, хутчэй квір і цысгендарная жанчына гетэравыгляду, і сапраўды вельмі забаўная. Я люблю чытаць, вучыцца, размаўляць зь людзьмі, думаць пра рэчы і надаваць ім сэнс.





МЭГ-ДЖОН БАРКЕР

Я займаюся пісьменьніцтвам, тэрапіяй і прапагаваньнем навукі. Жыву ў Лёндане (Вялікабрытанія). Я таксама транс-маскулінная, небінарная, бі -і квір-асоба, родам з Паўночнай Ангельшчыны. Я люблю тлумачыць акадэмічныя, тэрапэўтычныя і актывісцкія ідэі такім чынам, каб людзі маглі з карысьцю ўжываць іх у паўсядзённым жыцьці. Вы можаце знайсьці некаторыя з маіх кнігаў на старонцы 22.



АЛЕКС ЯНТАФІ

Мой прафэсійны занятак зьвязаны з тэрапіяй, пісьменьніцтвам, аратарствам, навукай, пэдагогікай. Я таксама транс-маскулінная, небінарная, бі-, квір-асоба, італійскага іміграцкага паходжаньня, бацька, маю інвалідства. Цяпер жыву, кахаю і працую на тэрыторыі Дакоты і Анішынаабе на выспе Чарапахі, мясцовасьці, таксама вядомай як Дулут, Мінэсота, ЗША. Мяне захапляе гаючая справядлівасьць, і я люблю дзяліцца ведамі па-за межамі акадэмічных колаў.



ДЖУЛС ШЫЛ

Я - транс незалежны ілюстратар, мастак коміксаў і жывы ілюстратар / графічны пасярэднік, што жыве ў Глазга, Шкоцыя. Я спэцыялізуюся на графічным апавяданьні і ілюстрацыях, якія дапамагаюць з перакладам і дадаюць людзкасьці складаным ідэям. У сваёй працы я ствараю шмат зінаў, натхнёных квір-жыцьцём і мастацтвам, псыхічным здароўем і поп-культурай.

Ілюстрацыі

ДЖУЛС ШЫЛ



2018